2) словарные слова, к которым можно подобрать *графические ассоциации* (образ представляется чаще всего в виде рисунка, на котором изображена ключевая буква орнамента определенной формы, символа: ***ого****род* — изображение овощей круглой формы;

3) словарные слова, к которым можно придумать *комбинированный ассоциативный образ* — сочетание словесного и графического образов: *хорошо* — ***o****kay* (англ.); рисунок с изображением комбинации из пальцев кисти, напоминающей букву «о».

Собственные наблюдения позволяют утверждать, что ассоциативный образ необходимо подбирать с учетом следующих правил:

– «проверочное» слово (образ) не является родственным, однокоренным к словарному по своей сути, но оно должно быть связано с непроверяемым словом каким-то общим признаком, «мостом» (пусть даже очень отдаленным); образ необходимо связать с предметным содержанием;

– «проверочное» слово не вызывает сомнений в написании, т. е. буква-«помощница» должна обозначать звук, стоящий в сильной позиции;

– образ должен быть простым, красочным и вызывать положительные эмоции у младшего школьника;

– ассоциативный образ нужно создавать самостоятельно, на основе образца и без него, поэтому учителю не следует навязывать ученикам свою ассоциацию.

Для того чтобы словесное, графическое, комбинированное запоминание словарных слов было более эффективным, необходимо использовать разные виды лексических упражнений, в языковом материале которых непроверяемые слова и ассоциативные образы вступают во взаимосвязь. Значимым является частое использование одного и того же слова (не меньше 5—6 раз) на различных этапах урока: актуализации знаний учащихся; в ходе проведения минуток чистописания, словарно-орфографической работы; закрепления понимания школьниками нового правила/понятия; в ходе осуществления рефлексивной деятельности младших школьников, а также при выполнении домашнего задания.

В целях выявления эффективности разработанной системы занятий с использованием описанных выше приемов мнемотехники обучающимся было предложено написать контрольный словарный диктант, в который вошли следующие 10 слов: *медаль, телевизор, памятник, ещё, океан, ромашка, пуговица, мечтать, мороженое, олень*; а также дополнительно 4 слова, в которых ранее учащиеся часто делали ошибки: *фломастер, компьютер, асфальт, транспорт*.

Анализ письменных работ четвероклассников показал, что общее количество ошибок, допущенных учениками в диктанте, уменьшилось в 3 раза (17 и 5 соответственно). Следовательно, средний уровень орфографической грамотности равен 90,7 % (на констатирующем этапе — 73,9 %).

**Заключение.** Анализ результатов проведенного исследования позволяет сформулировать вывод о том, что мнемотехнические приемы являются эффективным средством совершенствования навыков правописания непроверяемых слов младшими школьниками. Систематическое и системное использование мнемотехники наряду с традиционными методическими приемами положительно влияет на развитие умений учеников в осуществлении различных мыслительных операций, способствует осознанному усвоению ими сложного для восприятия материала, оживляет работу на уроках, делает ее более интересной, продуктивной.

**Список цитируемых источников**

1. Современный энциклопедический словарь [Электронный ресурс]. — Режим доступа: https://encyclopediadic.slovaronline.comт . — Дата доступа: 17.06.2020.

2. *Козаренко, В. А.* Учебник мнемотехники. Система запоминания «Джордано» / В. А. Козаренко. — М. : Литмир, 2007. — 350 с.

3. *Демидова, Н. И.* Теория и практика обучения русскому языку : учеб. пособие для студентов пед. учеб. заведений / Н. И. Демидова. — М. : Академия, 2014. — 320 с.

4. *Сайковская, Н. А.* Реализация деятельностного подхода в практике обучения младших школьников русскому языку : учеб.-метод. пособие / Н. А. Сайковская. — Минск : Мин. обл. ИРО, 2012. — 135 с.

5. *Эренберг, О.* Приёмы запоминания информации / О. Эренбург. — Режим доступа: http://www.toptrening.ru/articles . — Дата доступа: 15.06.2020.

Репозиторий

УДК 821.161.3:292

**Э. В. Томкавіч**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт», Баранавічы*

# ВОБРАЗ ЛЯСНОГА ЦАРА Ў МІФАЛОГІІ

**Уводзіны.** У беларускай літаратуры сустракаецца вобраз Ляснога Цара, Лесавіка, гаспадара лесу, напрыклад, у творах М. Багдановіча, У. Караткевіча, А. Сыса і інш. Каб аналізаваць гэты вобраз у тэксце, неабходна пазнаёміцца з яго зместам у міфалогіі. У дадзеным артыкуле зроблена спроба асэнсаваць вобраз Лесавіка ў міфалогіі, апісаць характар гэтага персанажа, яго знешнасць, паводзіны.

© Томкавіч Э. В., 2020

**Асноўная частка.** З'яўленне міфалагічных вобразаў звязана з язычніцтвам. Гэта ўмоўны тэрмін, які абазначае старадаўнія вераванні, што існавалі да ўзнікнення трох сусветных рэлігій (будызму, хрысціянства, ісламу). Аналіз навуковых крыніц пацвярджае, што ў традыцыйнай народнай культуры назіраецца культ духаў-гаспадароў, шанаванне духаў. Іх з'яўленне «звязваюць з паданнем пра паходжанне бачных і нябачных людзей ад адных бацькоў (ад звычайных людзей, ад Адама і Евы, Ноя). Гэтыя бацькі паказалі Богу (хрысцілі) адных дзяцей, а астатніх — не паказалі (не хрысцілі), і яны сталі нябачнымі; таксама мяркуюць, што духі-гаспадары паходзяць ад памерлых дзяцей ці ад шлюбу паміж людзьмі бачнымі і нябачнымі, ці ад скрадзеных дзяцей» [1, с. 739].

Духі-гаспадары ўяўляюцца ў антрапаморфным абліччы і лічацца гаспадарамі прыродных або штучных аб'ектаў. Убачыць духаў-гаспадароў лесу ў іх чалавекападобным абліччы могуць толькі асобныя людзі. Духі-гаспадары апранаюцца як сяляне, часам носяць багатую вопратку, некаторыя маюць кашлатыя валасы. Існуе меркаванне, што звычайны чалавек не бачыць сапраўднага аблічча духаў-гаспадароў. Іх прысутнасць праяўляецца павевам цёплага паветра, віхром, бурай. Дух-гаспадар з'яўляецца апоўдзень або апоўначы ў месцы, дзе звычайна, як лічыцца, ён павінен гаспадарыць, жыць. Чалавек чуе ў лесе або ў хаце нязвыклыя гукі (напрыклад, ляскат, нібы хтосьці б'е пугай). Духі-гаспадары могуць прымаць выгляд не толькі чалавека, але і жывёлы, птушкі, пня і інш.

Імёны духаў-гаспадароў Вадзянік, Гуменнік, Дабрахочы, Дамавік, Лясун, Палявік і іншыя звычайна ўказваюць на месца іх існавання: хата, гаспадарчыя пабудовы, поле, лес, вадаём. Некаторыя імёны змяшчаюць інфармацыю пра ўзаемадачыненні духаў: уласніцкія — пан, цар, гаспадар, «хазяін»; сямейныя — маці, бацька, дзед. Да славянскіх уласных імёнаў духаў-гаспадароў часам дадаюцца імёны па-бацьку або мастацкія азначэнні: пан Баравы Сцяпан, Лесавіца Маўра, Святы Антоні, Святая Лісавета Хвёдараўна (Лясун і Лесуніха), Аграсім Аграсімавіч [1, с. 739]. Лічыцца, што духі-гаспадары жывуць сем'ямі, у іх ёсць свае вёскі. Яны могуць існаваць у тых жа дамах, што і людзі. У доме, аднак, можа сяліцца толькі адзін дух-гаспадар або яго сям'я.

Культ духаў-гаспадароў патрабуе ад чалавека выканання рытуальных і традыцыйных дзеянняў: падтрымліваць двор у чысціні, паказваць дарогу падарожнаму, клапаціцца пра знойдзенае немаўля, вітацца, класці падарункі ў хаце, хляве, пры ўваходзе ў лес, ваду; не пераходзіць дарогу, дзе ездзяць духі-гаспадары, не спаць на дарозе і не рабіць на ёй непрыстойныя справы, не сварыцца, не зневажаць. Калі «нябачныя гаспадары» пачыналі шкодзіць, іх спрабавалі задобрыць або прагнаць. Чалавек, аднак, заўсёды імкнуўся мірна суіснаваць з духамі. Яны, паводле народнага ўяўлення, папярэджваюць пра няшчасце, гора. Духаў-гаспадароў ушаноўвалі ў час гаспадарчай працы і каляндарных, сямейных абрадаў. Іх прасілі аберагаць чалавека, яго дзяцей, ахоўваць дамашнюю жывёлу, асабліва на Юр'я. У ягады ішлі толькі пасля таго, як дазволіў Лясун, пыталіся, ці можна будаваць хату на пэўным месцы, хрыстосаваліся з духамі-гаспадарамі на Вялікдзень, прасілі даць шчаслівую долю немаўляці.

Жыхары вёскі імкнуліся пасябраваць з духамі-гаспадарамі, каб тыя дапамаглі ў працы: млынару, рыбалову неабходна падтрымка Вадзеніка, бортніку — Лесуна і Вадзеніка, паляўнічаму, пастуху — Лесуна. Вучоныя адзначаюць, што «духі-гаспадары могуць як наслаць хваробу, так і па просьбе знахара вылечыць ад такіх хвароб, як радзімец, дзяцінец, начніцы, крыксы, падвей, сурокі. Просьба да духа-гаспадара вызначаецца рытмічнай арганізацыяй, наяўнасцю рыфмаў і памяншальных вытворных» [1, с. 740]. Такім чынам, дваістае стаўленне да Лесуна тлумачыцца тым, што, з аднаго боку, ён можа чалавеку нашкодзіць (прымусіць яго блукаць, напалохаць, пазбавіць паляўнічай здабычы), з другога — дапамагчы. У энцыклапедыі «Беларускі фальклор» адзначаецца, што «ў замовах Лясун ("правялікі пан", "справядлівы", "цар грозны") фігуруе як выратавальнік ад сурокаў, крыксаў, згубы скаціны і нават нячыстай сілы. За паслугу з боку чалавека Лясун можа надаць яму знахарскія здольнасці і спрыяць у лясных промыслах. Каб дасягнуць апошняга, яшчэ ў канцы XIX стагоддзя Лесуну прыносілі ахвяры; паляўнічыя, як і моцныя чараўнікі (Вяліжскі павет), маліліся ў лесе» [2, с. 71].

Адзін з духаў-гаспадароў — Лясны Цар, Лясун, дух лесу, які валодае багаццямі і мае вялікія лясныя харомы. Лясун — «начальнік» над усімі дрэвамі і звярамі, без яго дазволу ў лес заходзіць не варта. Дакладнае апісанне гэтага персанажа ў вераваннях беларусаў знаходзім у энцыклапедыі «Беларускі фальклор». У. А. Лобач адзначае: «Лясун, Дабрахот, Дабрахочы, Верасовы Дзядок, Лесавік, Лясны Дзед, Лясны Хазяін, Часной Лесу, у беларускай міфалогіі дух — увасабленне лесу як часткі прасторы, патэнцыяльна чужой чалавеку. Кожны лясны масіў мае свайго гаспадара — Лясуна, які апякуецца над усімі звярамі і птушкамі (ратуе іх ад пажару, паляўнічых і г. д.). Лясун пры неабходнасці мае здольнасць павялічвацца (у лесе) і памяншацца (у полі)» [3, с. 285].

Лясны Цар уяўляецца з каронай на галаве на лясным узлеску або на палянах. Яго голас можна пачуць у ціхім і таямнічым начным шоргаце лістоты. Менавіта Лясны Цар імкнецца заваблць маладых людзей, юнакоў у свае прасторы для таго, каб, выгадаваўшы іх у палацы, ажаніць са сваімі дочкамі. Лясны Цар — уладар, галоўны ў лесе; ён старэйшы паміж ляснымі жыхарамі і людзьмі. Даведаўшыся, што ў гушчары жыве Лясны Цар, чалавек абыходзіць, не кранае гэтае месца. Па гэтай прычыне густы лес у славян лічыцца запаведным, свяшчэнным. Вобраз Лесуна быў распаўсюджаны па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Вера ў яго служыла ўсталяванню своеасаблівай экалагічнай раўнавагі паміж чалавекам і прыродай (лесам). Пад уплывам хрысціянства Лясун набывае рысы незвычайна злога і шкоднага нячысціка.

Рэпазіторый БарДУ

Вобраз Лесуна сустракаецца ў вераваннях розных еўрапейскіх народаў. Блізкім па сваім змесце да гэтай уяўнай істоты з'яўляецца эльф — прыродны дух. У скандынаўскай міфалогіі гаспадарамі лесу з'яўляюцца менавіта яны, эльфы (па-дацку — elv, па-шведску — älv, па-нарвежску — alv, па-ісландску — àlf-ur). Як сцвярджае рускі пісьменнік А. К. Булыгін, «эльфы жывуць побач з людзьмі: на гары, у лесе, у дрэве (дрэва ў такім выпадку нельга секчы), водзяць ноччу карагоды, завабліваюць да сябе падарожнікаў, часам зводзяць юнакоў ці дзяўчат» [4, с. 1]. Яны, аднак, могуць быць прычынай раптоўнай хваробы або вар'яцтва людзей. Ёсць эльфы светлыя і цёмныя. Светлыя эльфы (або альвы) у скандынаўскіх міфах — духі прыроды (першапачаткова душы памерлых людзей), па сваіх функцыях блізкія да ванаў — багоў урадлівасці і марской стыхіі. Свет эльфаў называюць «краінай вечнага юнацтва», таму што час тут цячэ па-іншаму, не так, як у людзей. Напрыклад, у шатландскай казцы «Два скрыпачы са Стратспі» музыкі, якія гулялі на балі ў эльфаў адну ноч, вяртаюцца ў свой горад праз сто гадоў.

**Заключэнне.** З'яўленне вобразаў духаў-гаспадароў звязана з язычніцтвам, якое патрабавала шанавання нябачных існасцей, асцярогі ў адносінах да іх з боку чалавека. Суіснаванне духаў-гаспадароў і людзей выяўляе гарманічныя адносіны чалавека да прыроды. З прыняццем хрысціянства духі-гаспадары атрымліваюць выразна негатыўны сэнс. Лясны Цар, Лесавік — дух лесу, які валодае багаццямі і мае раскошныя лясныя харомы. Па сваім змесце блізкім да гэтага вобраза з'яўляецца, напрыклад, скандынаўскі эльф. Вобраз Ляснога Цара, Лесавіка — надзвычай каларытны, у міфалогіі ён мае даволі дэталёвае апісанне. Вобраз Лесавіка звязаны не толькі з вераваннямі славян, беларусаў, іншых еўрапейскіх народаў. Ён стаў крыніцай для стварэння адпаведных вобразаў у мастацкай літаратуры.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БэлЭн, 2005. — Т. 1 : Акапэла — Куцця. — 768 с.
2. Беларускі фальклор : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. — Мінск : БелЭн, 2006. — Т. 2 : Лабараторыя традыцыйнага мастацтва — «Яшчур». — 832 с.
3. Беларуская міфалогія : энцыклапед. слоўн. / С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. — Мінск : Беларусь, 2006. — 599 с.
4. *Булыгін, А. К.* Хто такі Лясны Цар? [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://www.liveinternet.ru/users/4538230/post305029881 . — Дата доступу: 26.03.2020.

УДК 372.882

**Т. Л. Харытонава**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Ляснянская сярэдняя школа» Баранавіцкага раёна*

## МАГЧЫМАСЦІ КРАЯЗНАЎЧАГА МАТЭРЫЯЛУ ПРЫ АРГАНІЗАЦЫІ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ РАБОТЫ ПА БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

**Уводзіны.** Вучэбная праграма па прадмеце «Беларуская літаратура» ў сярэдняй школе накіроўвае працу настаўніка на наладжванне адукацыйнага працэсу такім чынам, каб вучні авалодвалі вопытам літаратурна-творчай дзейнасці, развівалі творчыя схільнасці праз далучэнне да мастацтва слова ў кантэксце духоўнага і сацыяльна-гістарычнага жыцця народа.

Арганізацыя навукова-даследчай работы па літаратуры ў школе ўяўляе сабой складаны працэс, звязаны з такімі праблемамі, як выяўленне творчых, філалагічна адораных вучняў, у якіх ёсць цікавасць і жаданне займацца даследаваннем; падрыхтаванасць да гэтай работы настаўніка, які валодае методыкай арганізацыі і напісання навуковых прац; разуменне спецыфікі літаратурнага даследавання, арыентаванага на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкасць; узровень маўленчай культуры вучняў, здольных на самавыражэнне на беларускай мове, асабліва ў рускамоўных школах.

Адным з дзейсных сродкаў павышэння матывацыі да заняцця вучнямі навукова-даследчай працай па літаратуры з'яўляецца зварот да краязнаўчага матэрыялу.

**Асноўная частка.** Пад *літаратурным краязнаўствам* трэба разумець вучэбна-выхаваўчую работу, у ходзе якой вывучаюцца літаратурныя факты, з'явы, падзеі, звязаныя з той мясцовасцю, дзе знаходзіцца школа. «Агульнапрынятым стала палажэнне, што, каб зразумець пісьменніка, трэба пабываць на яго радзіме. Творчасць мастака нельга разглядаць у адрыве ад таго асяроддзя, дзе ён нарадзіўся і жыў, бо яно накладвае пэўны адбітак на яго светаўспрыманне, узбагачае жыццёвым вопытам і з'яўляецца патэнцыяльным матэрыялам для будучых твораў. Большасць пісьменнікаў у сваёй творчасці ідзе ад асабіста перажытага» [2, с. 22].

Змест і методыка літаратурна-краязнаўчай працы павінны суаднасіцца з асаблівасцямі ўзроставай эвалюцыі юнага даследчыка. Асноўныя формы працы павінны садзейнічаць літаратурнаму развіццю асобы вучня, захоўваць сістэматычнасць і пераемнасць гэтай працы ў розных узроставых групах. Гэта неабходна

© Харытонава Т. Л., 2020

Рэпазіторый БарДУ